*А.М. Макарэвіч (Магілёў)*

# АКТУАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЖАНРАЛОГІІ (на прыкладзе характарыстыкі пытання "раман і яго разнавіднасці")

Жаналогія становіцца неад'емнай часткай даследавання спецыфікі мастацкага мыслення канкрэтнага аўтара і адпаведнай літаратурнай эпохі, канкрэтнага індывіда, групы людзей і грамадства ў цэлым у лакальнай часавай і геаграфічнай прасторы.

Жанравыя формы і іх мадыфікацыі – гэта адпаведныя формы адлюстравання жыцця, якое ўспрымаецца "вачыма" трансфармаванай і адаптаванай да Я-свядомасці літаратурнага героя Я-свядомасцю пісьменніка. Жанравая мадыфікацыя з яе сэнсава- і структураўтваральнымі асаблівасцямі з'яўляецца пры гэтым вострававам злучэння рэальнай і пераўвасобленай свядомасці пісьменніка (аб гэтым у [11, с. 18, 22 – 23]).

Жанравыя формы рамана і іх мадыфікацыі ў абагуленым варыянце можна прасачыць на прыкладзе класіфікацый, якія прапаноўваюцца ў паказальных тэарэтычных крыніцах украінскага, рускага, польскага, беларускага літаратуразнаўства.

Тэорыя літаратуры пад навуковай рэдакцыяй А.Галіча (Кіеў, 2001) звяртае ўвагу на класіфікацыю рамана паводле зместу і формы, адзначаючы пры гэтым, што *"такі падзел не заўсёды будзе карэктным з пункту погляду тэорыі, паколькі адзін і той жа твор можа быць адначасова і сацыяльным, і гістарычным, і прыгодніцкім. У такім выпадку трэба мець на ўвазе, якая рыса дамінуе ў творы"* [5, с. 265]. Гэтая ж крыніца прапануе падзел сучаснага ўкраінскага рамана на жанравыя разнавіднасці (різновиди) паводле зместу (*гістарычны, сацыяльна-псіхалагічны, фантастычны, сатырычны, ваенна-патрыятычны, біяграфічны, мемуарны* раман) і формы апавядання (*раман у навелах, хімерны раман, раман-споведзь*).

У "Літаратуразнаўчым слоўніку-даведніку" (Кіеў, 1997) прапаноўваецца падзел рамана паводле

а) літаратурных эпох, перыядаў, цячэнняў, стыляў і тэарэтычных палажэнняў (*асветніцкі, сярэднявечны, барочны, сентыментальны, рамантычны, экзістэнцыйны раман* і інш.);

б) зместу (*сацыяльны, сямейна-побытавы, сацыяльна-побытавы, гістарычны, філасофскі, сатырычны, прыгодніцкі, біяграфічны, навукова-фантастычны* і інш.);



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

в) часу разгортвання сюжэту (*гістарычны* – у ім адлюстроўваюцца падзеі мінулага, *сучасны* – у ім адлюстроўваюцца "цяперашнія падзеі", *рамана пра будучае* – у ім адлюстроўваюцца прадбачанні аўтарам падзей, напрыклад у навукова-фантастычным рамане);

г) тэматыкі альбо адлюстраванага асяроддзя (*урбаністычны раман, марыністычны раман*), часам іх разглядаюць як падвіды рамана ў кантэксце класіфікацый паводле зместу (напрыклад, *аўтабіяграфічны раман* – разнавіднасць біяграфічнага, *раман на тэму вёскі* – разнавіднасць сацыяльнага, *сямейны раман* – разнавіднасць сямейна-побытавага) [9, с. 606].

Акрамя гэтага, у названай крыніцы вызначаюцца прыкметы такіх разнавіднасцей рамана, як *аўтабіяграфічны, біяграфічны, гатычны, або раман жахаў, дэтэктыўны, альбо крымінальны, гістарычны, авантюрны, навукова-фантастычны, прыгодніцкі, сацыяльна-побытавы, тэндэнцыйны, фантастычны, філасофскі*, а таксама *раман у вершах і раман-дзённік* [9, с. 606 – 612].

Падобнае ўзрастанне якасці тэматычных і структурных вызначэнняў характэрна і для рускага літаратуразнаўства.

Так, напрыклад, у "Литературном энциклопедическом словаре" (1987) пры вызначэнні жанравых мадыфікацый рамана змешваліся фармаўтваральныя і зместаўтваральныя крытэрыі аднясення, у выніку прапаноўвалася няўстойлівая ў метадалагічных адносінах класіфікацыя жанравых разнавіднасцей: *гісторыка-біяграфічны раман, нацыянальна-гістарычны раман, раман-выхаванне, сацыяльна-псіхалагічны раман, героіка-рамантычны, сатырычны, навукова-фантастычны раман, раман-прытча, раман-эпапея* [3, с. 333].

У пазнейшай па часе выдання "Литературной энциклопедии терминов и понятий" (2003) ужо не назіраецца такое формаўтваральнае і сэнсаўтваральнае змяшэнне ў класіфікацыі жанравых мадыфікацый рамана. Гэтая энцыклапедыя прапаноўвае тэматычны, структурны і эпахальны ("*исторически сложившиеся обозначения*") падзел у межах рамана. Тэматычны: *аўтабіяграфічны, ваенны, дэтэктыўны, дакументальны, жаночы, інтэлектуальны, гістарычны, марскі, палітычны, прыгодніцкі, сатырычны, сентыментальны, сацыяльны, фантастычны, філасофскі, эратычны* і да т.п.; структурны: *раман у вершах, раман-памфлет, раман-прытча, раман з ключом, раман-сага, раман-фельетон, раман-скрыня* ("роман-ящик (набор эпизодов"), *раман-рака, эпісталярны* і інш. амаль да сучасных *тэлерамана, фотарамана*; эпахальны: *антычны, віктарыянскі, гатычны, мадэрнісцкі, натуралістычны, махлярскі* ("плутовской"), *асветніцкі, рыцарскі, эліністычны* і інш [7, с. 889 – 892].



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

У польскіх энцыклапедычна-тэарэтычных і тэарэтычных выданнях прапануецца падзел рамана (*powieści*) паводле пэўнай тэматыкі і структуры.

Пры гэтым у энцыклапедычных выданнях (напрыклад, у "*Słówniku terminów literackich*" Ст.Сератвіньскего, 1986) прапаноўваецца больш-менш сістэматызаваны падзел разнавіднасцей рамана: з пункту погляду тэматыкі (*гістарычны, побытавы* (сацыяльна-побытавы – [21, с. 376]), *псіхалагічны, любоўны (romans), авантурны, падарожны, крымінальны, навукова-фантастычны* (фантастычны – [21, с. 377]), *публіцыстычны, палітычны* раман) і формы твора. Пры гэтым адзначаецца, што раман выкарыстоўвае структурныя формы іншых літаратурных відаў, выпрацоўваючы такія формы, як *раман-дзённік, -мемуары, -запіскі – powieść-pamiętnik, раман у лістах, аўтабіяграфічны, эсэістычны раман*; адзначаецца таксама, што падзел на тэматычныя і кампазіцыйныя разнавіднасці праводзіцца з розных пунктаў погляду, бо канкрэтныя творы часта вызначаюцца змешанымі прыкметамі і могуць характарызавацца некалькімі вызначэннямі [23, с. 187]; звяртаецца ўвага на тое, што цяжка вылучаць структурныя адрозненні ў межах адпаведных разнавіднасцей, хаця ў некаторых выпадках (напрыклад, у крымінальным рамане) гэта магчыма [21, с. 376]. Акрамя гэтага, "*Zarys teorii literatury*" (1986) вылучае *сенсацыйны, біяграфічны і сямейны раманы*; у апошняй разнавіднасці вылучаецца *раман-рака* (шматтомны раман, які адлюстроўвае жыццё сям'і ў некалькіх пакаленнях – [21, с. 376 – 379]).

Польскія тэарэтычныя крыніцы, больш познія паводле часу выдання, удакладняюць ахарактарызаваны вышэй падзел. Так, напрыклад, А.Кулявік адзначае, што змены раманнай тэхнікі адбываюцца ў межах прадстаўлення і здрабнення фабулы, у межах прэзентацыі нарацыйнай сітуацыі і прадстаўленага мастацкага свету – такая тэхніка вызначаецца вялікай разнастайнасцю – таму дакладная класіфікацыя рамана практычна немагчымая. Прадстаўленыя А.Кулявікам тыпы і падтыпы рамана, як адзначае сам аўтар, *не ўзвышаюцца над абстрактнай мадэллю, з якой можна параўнаць канкрэтны раманны твор дзеля таго, каб устанавіць ступень яго набліжэння да мадэлі*. А.Кулявік вылучае *гістарычныя, сучасныя, фантастычныя раманы*, крытэрый падзелу пры гэтым – адносіны фабульнага часу твора да моманту стварэння рамана; з пункту погляду тыпа героя вылучаюцца *псіхалагічны і ідавочна псіхалагічны (powieść behawiorystyczna) раман*; тып раманнай фабулы дазваляе вылучыць *авантурны раман, альбо крымінальны*; раманная тэматыка дазваляе размяжоўваць у групе раманаў паводле тыпа рэцыпіента *маладзёжныя, вытворчыя, марыністычныя* (марскія) і да т.п. раманы [22, с. 348 – 355].



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

У беларускіх даведачна-тэарэтычных крыніцах пакуль што адсутнічае разгорнутая сістэматызаваная структурная характарыстыка жанраў, у тым ліку і рамана. У "Тэорыі літаратуры ў тэрмінах" В.П.Рагойшы прыводзіцца традыцыйная характарыстыка рамана як жанра: пры класіфікацыі не размяжоўваюцца зместа-, сэнсаўтваральныя і структурныя паказчыкі твораў. В.П.Рагойша вылучае ў беларускім рамане *сацыяльна-бытавы і сацыяльна-палітычны* *__жанры__* (падкрэслена мной. – А.М.), *сатырычны, гістарычны раман,* [18, с. 263] *раман-эпапею* [18, с.359].

У беларускім літаратуразнаўстве сітуацыя ў адносінах да жанравага даследавання рамана яшчэ застаецца даволі складанай.

Аўтар "Тэорыі літаратуры ў тэрмінах", імкнучыся, відаць, прадстаўніча адлюстраваць жанравыя вызначэнні з прыватных літаратуразнаўчых даследаванняў, у той жа час апасродкавана паказаў бессістэмнасць у жанравых вызначэннях такіх катэгорый, як раман, хроніка, эпапея. Калі мець на ўвазе, што тэарэтычныя даведнікі павінны сістэматызавана адлюстроўваць тэарэтычныя дасягненні літаратуразнаўства, то ў названай крыніцы адлюстравана якраз бессістэмнасць жанравых вызначэнняў і характарыстык у адносінах да рамана ў межах беларускага літаратуразнаўства. Так, напрыклад, "Палеская хроніка" І.Мележа і "*цыкл ваенных раманаў*" І.Чыгрынава ў гэтай крыніцы вызначаюцца то як *хроніка* [18, с. 342], то як "*найбліжэйшы падыход да напісання эпапеі*" [18, с. 263], то як "*спроба стварыць беларускую літаратурную Э[папею]*" [18, с. 263, 359]; раман У.Караткевіча "Каласы пад сярпом тваім" у адным выпадку вызначаецца як "*узор гістарычнага рамана, які сваёй мастацкай сутнасцю набліжаецца да эпапеі*" [18, с. 263], у другім як "*спроба стварыць беларускую літаратурную эпапею*" [18, с. 359].

Такія вызначэнні не выклікаюць здзіўлення, бо яны – апасродкаванае адлюстраванне падобнага разнабою жанравых аднясенняў у асобных манаграфічных даследаваннях. Напрыклад, "Палеская хроніка" ў межах аднаго і таго ж даследавання (Ф.І.Куляшоў, 1982) вызначаецца то як "*мастацкая хроніка пра Палессе*" [8, с. 193], то як "*гістарычная хроніка*" паводле фактычнага матэрыялу, [8, с. 195], то як "*палеская эпапея*" [8, с. 197], то як жанр "*сацыяльна-псіхалагічнага рамана*" [8, с. 199]; назіраецца, напрыклад, двухсэнсоўнасць і невыразнасць у адносінах да вызначэння "жанравай разнавіднасці" *лірычнага рамана* ў спадчыне Я.Брыля ([17]), формаўтваральных у межах жанру перакрыжаванняў ([19]) і інш.

Неадназначнасць формаўтваральных характарыстык і мадыфікацыйных вызначэнняў рамана ў беларускім літаратуразнаўстве можна прасачыць на прыкладзе жанравых вызначэнняў твораў М.Гарэцкага



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

"Віленскія камунары" (1931 – 1932) і "Камароўская хроніка" (1923 – 1932, 1932 – 1937): *раман* (В.Атрашкевіч [2, с. 121], М.Караткоў [6, с. 150], І.Чыгрын [20, с. 130, 143], Дз.Бугаёў [4, с. 158]), *раман-хроніка* (М.Мушынскі [15, с. 358, 364; 16, с. 413], М.Мішчанчук [14, с. 526]), *твор, які нясе ў сабе жанравыя адзнакі рамана-эпапеі* (М.Мушынскі [15, с. 358, 364]) – "Віленскія камунары", *эпапея-дзённік* (А.Адамовіч [1, с. 315]), *дзённікава-хранікальная эпапея* (М.Караткоў " [6, с. 150]), *аповесць* (М.Мушынскі [16, с. 417], І.Чыгрын [20, с. 160]), *раман* (М.Мішчанчук [14, с. 528]) – "Камароўская хроніка". У чатырохтомным зборы твораў М.Гарэцкага (1984 – 1986) гэтыя творы вызначаюцца як *раман-хроніка* ("Віленскія камунары") і *аповесць* ("Камароўская хроніка").

Пры гэтым звяртае на сябе ўвагу імкненне даследчыкаў да аналізу ў першую чаргу сэнсавых асаблівасцей твораў; формаўтваральны ж і стылёвы бок "Віленскіх камунараў" і "Камароўскай хронікі" застаюцца доказна не ахарактарызаванымі.

Перш чым непасрэдна вызначыць, напрыклад, жанравую мадыфікацыю "Камароўскай хронікі" М.Гарэцкага, звернем увагу на наступныя факты:

- літаратура старажытнага перыяду дала ўзоры зместу і формы мастацкага ўзнаўлення мінулай рэчаіснасці праз апавядальную гісторыю (Біблія, жыційная, летапісная і гісторыка-мемуарная літаратура; выразным прыкладам апавядальнай гісторыі эпізодавага характару можа быць расказ аб смерці Афанасія Філіповіча, які прымыкае да яго "Дыярыуша"; праз метафарычную форму, форму гісторыі-плача выкладаецца гісторыя ўзвышэння і заняпаду праваслаўнай царквы ў творы М.Сматрыцкага "Плач адзінай апостальскай усходняй царквы...");
- узор канцэпцыйнага выкарыстання апавядальнай гісторыі жанравай формы прадстаўлены ў зборніку апавяданняў Я.Баршчэўскага "Шляхціц Завальня..." – XIX ст.;
- апавядальная гісторыя як жанравая форма "малой" прозы пачынае набываць характарыстычныя формаўтваральныя прыкметы, гэтая тэндэнцыя затым у літаратуры пачатку XX ст. асабліва выразна праявілася ў творчасці Ядвігіна Ш., М.Гарэцкага, В.Ластоўскага, М.Багдановіча, Я.Коласа і інш. пісьменнікаў.

Не ў адзінкавым прыкладзе прадстаўлены апавядальныя гісторыі ў "малой" прозе М.Гарэцкага пач. XX ст. (аб гэтым – [11; 12, с. 114 – 126]), 20-х гадоў (зборнік "Досвіткі", цыкл "Сібірскія абразкі" (аб гэтым – 10, с. 22 – 49, 54 – 98]).

Герой-апавядальнік выходзіць на першы план і ў "малой" прозе М.Гарэцкага, і ў "Віленскіх камунарах", і ў "Камароўскай хроніцы".



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Апавядальнік з "Лявоніуса Задумекуса" (др. пал. 1931 – пач. 1932) і "Скарбаў жыцця" (1932 – 1935) як носьбіт Я-свядомасці не толькі пісьменніка, а і Я-свядомасці ўнутрана непадуладнай грамадскаму прымусу і гвалту асобы – ён застаўся сам-насам з варожа настроенай да яго рэчаіснасцю – сумна завяршае галерэю літаратурных тыпаў М.Гарэцкага.

Для героя-апавядальніка М.Гарэцкага характэрны, з аднаго боку, розны ўзровень дачынення – назірання, удзелу, уплыву і інш. – да ўзнаўляемых ім падзей. Але ж пры гэтым ён – апавядальнік – з'яўляецца носьбітам узнаўлення не толькі Я-свядомасці з прататыпнай рэчаіснасці, а і змадэляванай мастацкай Я-свядомасці, якая гарманічна ўключаецца ў мастацкі кантэкст твораў М.Гарэцкага і яго сэнсавай канцэпцыі.

З другога боку, апавядальнік М.Гарэцкага з'яўляецца галоўным арганізатарам развіцця падзей, сюжэтнага руху ў межах мастацкага свету твора. Такім чынам, апавядальнік тут – гэта своеасаблівы арганізатар жанравай мадэлі: апавядання, аповесці, рамана. З гэтага вынікае, што тып літаратурнага героя мастацкага твора – гэта не толькі істотны (калі не галоўны, як у рамане А.Мрыя "Запіскі Самсона Самасуя") фармаўтваральны элемент мастацкага твора, а і – у тэарэтычных адносінах – адзін з паказчыкаў, якія спрыяюць вызначэнню жанравай мадыфікацыі і фармаўтваральных асаблівасцей таго ці іншага жанру.

Вызначаныя тут асаблівасці можна пацвердзіць не толькі на прыкладзе апавядальных гісторый "малой" прозы, а і апавядальных гісторый у форме аповесці ("Золата" Ядвігіна Ш., "Прыгоды Панаса і Тараса" – аўтарскае вызначэнне жанру твора – В.Ластоўскага), рамана ("Запіскі Самсона Самасуя" А.Мрыя, "Віленскія камунары" і "Камароўская хроніка" М.Гарэцкага).

Жанравую градацыю "Віленскіх камунараў" М.Гарэцкага можна прадставіць наступным чынам: раман – хроніка – апавядальная гісторыя / абразок – унутраная перспектыва + Я-форма – стыль апавядальнай гісторыі (схема 1).

У "Віленскіх камунарах" адбываецца своеасаблівая стылізацыя пад хранікальныя ўспаміны, выкарыстоўваецца з даўніх часоў пашыраная літаратурная форма апавядальнай гісторыі. Пры гэтым такая форма адаптуецца М.Гарэцкім да больш шырокай творчай задачы: адлюстравання супярэчлівых падзей з гісторыі народа ў выглядзе хронікі – формы, блізкай да дакумента, рэальнага сведчання. Пісьменнік у дадзеным выпадку ставарае мастацкую гісторыю аднаго з вызначальных перыядаў у лёсе свайго народа. Пры гэтым у літаратурнай прасторы твора мадэлюецца атмасфера рэальна меўшых месца падзей. І тут форма хронікі аказваецца найбольш прыдатнай пры выкарыстанні ўжо асвоенага пісьменнікам стылю апавядальнай гісторыі і, часткова, абразка.



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Такім чынам, як сведчаць нават гэтыя кароткія тэзісы, пры характарыстыцы жанравай спецыфікі таго ці іншага твора, групы твораў ці творчасці пісьменніка неабходна ўлічваць не толькі тэматычны ці сэнсаўваральны аспект, але абавязкова спецыфіку жанравай і стылёвай арганізацыі твора як паказчыкаў спецыфікі мыслення індывіда, сацыяльных груп і грамадства ў цэлым.

Акрэсленыя жанразнаўчыя праблемы сведчаць пра тое, што даўно наспела неабходнасць стварэння ў беларускім літаратуразнаўстве не толькі гісторыі жанравага развіцця нацыянальнага прыгожага пісьменства, але і гісторыка-тэарэтычнага даведніка па жаналогіі – крыніц, якія б, з аднаго боку, па магчымасці поўна адлюстроўвалі пытанні і праблемы станаўлення, развіцця і ўзвышэння беларускага жанразнаўства ў кантэксце славянскага, з другога, прадстаўлялі мадэль жанравага развіцця нацыянальнай літаратуры – мадэль, якая б адлюстроўвала не толькі напрацоўкі аднаго аўтара ці калектыва, але аб'ядноўвала ў сабе шырокі спектр поглядаў, высноў, канцэпцый розных жанролагаў ці даследчых калектываў.

**Жанравыя і стылевыя асаблівасці «Віленскіх камунараў» М.Гарэцкага (паводле формы апавядання)**






Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

**Літаратура:**


1. ***Адамовіч А.*** Камароўская хроніка – творчая гісторыя, жанр // Збор твораў: У 4 т. Т. 4. Мінск, 1986. – С. 310 – 331.

2. ***Атрашкевіч В.І.*** Ад прататыпа да вобраза: Праблема аўтабіяграфізму ў беларускай прозе 20-х гадоў. – Мінск: Нав. і тэхніка, 1984. – С. 121 – 135.

3. ***Богданов В.А.*** Роман // Литературный энциклопедический словарь / Под общ. Ред. В.М.Кожевникова, П.А.Николаева. – М.: Сов. энциклопедия, 1987. – С. 329 – 333.

4. ***Бугаёў Дз.Я.*** Максім Гарэцкі. – 2- выд., выпр, дап. – Мінск: Бел. навука, 2003. – С. 158 – 175, 215 – 227.

5. ***Галич О., Назарець В., Васильєв Є.*** Теорія літератури / За наук. ред. О.Галича. – Київ: Либідь, 2001. – С. 264 – 269, 473.

6. ***Караткоў М.М.*** Гарэцкі М. Беларускія пісьменнікі: Біябліягр. слоўн: У 6 т. Т. 2. – Мінск, 1993. – С. 148 – 150.

7. ***Кожинов В.В.*** Роман // Литературная энциклопедия терминов и понятий / Под ред. А.Н.Николюкина. Ин-т науч. информации по общественным наукам РАН. – М.: НПК "Интелвак", 2003. – ст. 889 – 892.

8. ***Кулешов Ф.И.*** Подвиг художника: Лит. путь И.Мележа. – 2-е изд. – Минск: Изд-во БГУ, 1982. – С. 175 – 200.

9. Літературознавчий словник-довідник / ***Р.Т.Гром'як, Ю.І.Ковалів*** та ін. – К.: ВЦ "Академія", 1997 – С. 246 – 247, 604 – 612, 726.

10. ***Макаревич А.Н.*** В разных стилевых течениях: Проблема жанра и стиля в рассказах 20-х годов М.Горецкого и Т.Гартного. – Екатеринбург: Урал Плюс, 1995. – 177 с.

11. ***Макарэвіч А.М.*** Ад формы ўспрыняцця да формы адлюстравання (жанравыя мадыфікацыі беларускай прозы пачатку XX ст.) // Кулешовские чтения: Научно-практическая конференция "Творчество А.Кулешова и историко-культурный процесс": Тезисы докладов. – Могилев: МГУ им. А.А.Кулешова, 2001. – С. 18 – 23.

12. ***Макарэвіч А.М.*** Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX – пачатку XX ст. – Магілёў: Выд-ва МДУ імя А.А.Куляшова, 1999. – 332 с.

13. ***Макарэвіч А.М.*** Сэнсавая прастора зборніка апавяданняў Міры Лукшы "Бабскія гісторыі" ў кантэксце яго жанравай спецыфікі // Тэрмапілы. – 2003. – № 7. – С. 115 – 126.

14. ***Мішчанчук М.І.*** Максім Гарэцкі // Гісторыя беларускай літаратуры: XIX – пачатак XX ст. / Пад агульн. Рэд. М.А.Лазарука, А.А.Семяновіча. – Мінск: Выш. шк., 1998. – С. 526 – 529.

15. ***Мушынскі М.І.*** [Каментарыі] // Гарэцкі М. Збор твораў: У 4 т. Т. 3. Мінск, 1985. – С. 347 – 369.

16. ***Мушынскі М.І.*** Максім Гарэцкі // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: У 4 т. Т.1 / Нац. Акад. Навук Беларусі. Ін-т літаратуры імя Я.Купалы. – Мінск: Бел. навука, 1999. – С. 381 – 426.




Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

17. ***Нікіфарава В.*** Лірычны раман у творчасці І.Буніна і Я.Брыля // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: Матэрыялы ІУ Міжнар. навук. канф. (Мінск, 12 – 14 кастр. 1999 г.): У 2 ч. Ч. 1 / Рэдкал.: С.Я.Ганчарова-Грабоўская і інш. – Мінск: БДУ, 2000. – С. 175 – 177.

18. ***Рагойша В. П.*** Тэорыя літаратуры ў тэрмінах: Дапам. – Мінск: Бел. энцыклапедыя, 2001. – С. 262 – 263, 342 – 343.

19. ***Рагойша П.В.*** Жанрава-стылёвыя асаблівасці рамана Сяргея Пясецкага “Каханак Вялікай Мядзведзіцы” // Взаимодействие литератур в мировом литературном процессе (проблемы теоретической и исторической поэтики): Материалы междунар. науч. конф.: В 2 ч. Ч. 2 / Под ред. Т.Е.Автухович. – Гродно: ГрГУ, 2000. – С. 101 – 105.

20. ***Чыгрын І.П.*** Паміж былым і будучым: Проза Максіма Гарэцкага. – Мінск: Нав. і тэхніка, 1994. – С. 130 – 161.

21. ***Giowicski M., Okopiec-Siawicska A., Siawicski J.*** Zarys teorii literatury. Wyd. Pi№te. – Warszawa: Wydawnictwa Szkolne i Pedagogiczne, 1986. – S. 363 – 379.

22. ***Kulawik A.*** Poetyka. Wstкp do teorii dzieia literackiego. – Krakyw: Antykwa, 1997. – 348 – 355.

23. ***Sierotwicski S.*** Siownik terminyw literackich- Teoria i nauki pomocnicze literatury- Wyd. IV. – Wrociaw, Warszawa; Krakyw, Jydџ: Zakiad Narodowy im. Ossolicskich, 1986. – S. 124, 186 – 187.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова